умений и навыков изучения природных явлений, их анализа с точки зрения воздействия на них человека, для применения активных методов обучения и воспитания, инновационных форм организации занятий.

В связи с этим нам представляется очень важным дальнейшее проведение работ по совершенствованию и расширению пакета программных средств, прежде всего в плане его наполнения разработками по конкретным темам различных школьных дисциплин экологического профиля – биологии, географии, химии и т.д.

## ЛУЖАСНЯНСКІ ДЭНДРАПАРК: ПРАБЛЕМЫ І МАГЧЫМЫЯ ШЛЯХІ ІХ ВЫРАШЭННЯ

*М.В. Півавар*
**ВДУ імя П.М. Машэрава, г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь**
**e-mail: pivavar@gmail.com**

**Уводзіны.** Лужаснянскі дэндрапарк з’яўляецца помнікам прыроды і ахоўваецца дзяржавай з 1993 г. Яго калекцыя налічвала больш 250 вышэйшых сасудістых раслін, сярод якіх рэдкія, неўласцівыя для нашай мясцовасці і тыповыя для паўночнага рэгіёну нашай краіны віды. На жаль, на апошні час стан дэндрапарка істотна змяніўся. З’явіліся пэўныя праблемы, якія патрабуюць вырашэння. Мэта артыкула – вызначыць гэтыя праблемы. Актуальнасць – у вызначэнні пэўных шляхоў іх вырашэння.

**Матэрыялы і метады.** Дэндрапарк знаходзіцца ў вельмі маляўнічым месцы ў міжрэччы Дзвіны і Лужаснянкі. Цяперашняя яго плошча – 8,8 га. У яго планіроўцы спалучаюцца рэгулярны і ландшафтны стылі. Ад пачатку стварэння парку былі пастаўлены дзве мэты – стварыць калекцыю дрэваў для азнаямлення і навучання студэнтаў Лужаснянскага сельскагспадарчага тэхнікума з ўзорамі мясцовай, беларускай і замежнай флоры. Другая мэта – стварыць на беразе Дзвіны зону адпачынку для мясцовага насельніцтва.

Сцяжынкамі і алеямі тэрыторыя падзелена на 9 секцый (планавалася 13) [1]. Ад цэнтра парк дзеліцца кляновай, ліпавай, лістоўнічнай алеямі. Уздоўж Лужаснянкі вядзе бярозавая, уздоўж Дзвіны ясеневая алеі. У цэнтры парка створана альпійская горка і аформлены ракарый. Як правіла, дрэвы высаджаны далей ад дарожак, а розныя пароды кустоў між групамі дрэваў ці каля сцяжынак для зручнасці агляду.

Для ўючыхся раслін былі створаны, але амаль не захаваліся пергола і металічныя апоры. На іх былі высаджаны розныя віды вінаграда, дрэвагубец, капрыфоль, лунасемяннік даўрскі. Стромкі бераг Дзвіны ўздоўж дэндрапарка ўмацаваны высадкай аморфы кустарнікавай.

Колькасць дравесна-кустарнікавых раслін патрабуе рэвізіі, але можна казаць пра тое, што з 1990-х гадоў (час, калі праводзіліся апошнія рамонт-

Репозиторий ВГУ

ныя высадкі) тут вырастал каля 250 відаў дрэваў і кустарнікаў, а таксама некалькі дзесяткаў кветкавых шматгадовых раслін.

Сярод тыповых для Віцебшчыны відаў прыгадаем бярозу пухнатую і павіслую, дуб чарэшчаты, ліпу мелкалісную, клён востралісны, вольху шэрую, вяз гладкі (звычайны) і іншыя. Цікавасць уяўляюць інтрадуцэнты – расліны, не ўласцівыя нашай мясцовасці: піхта белая, дзёран звычайны, елка канадская, арэх манчжурскі, чорны, Зібальда

Візітовымі карткамі дэндрапарку з’яўляюца рэдкія і незвычайныя расліны. Напрыклад, тут вырастае бархат амурскі (коркавае дрэва), бук лясны (еўрапейскі), дугласіі, розныя віды хвояў, елак.

Асобны гонар парка – самая паўночная ў Беларусі пасадка шалковіцы белай. У даведніках можна знайсці інфармацыю, што самая паўночная пасадка знаходзіцца ў віцебскім батанічным садзе, але Лужасна на дзесяць кіламетраў паўночней.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** На жаль, на сённяшні дзень дэндрапарк мае шмат праблем. У ім шмат смецця. Састарэлі і разрасліся некаторыя дрэвы, кусты. Кусты, якія знаходзіліся на абсягу 5–7 метраў ад сцяжынак разрасліся наступаюць на сцяжыны. Некаторыя дэкаратыўныя дрэвы вымерзлі, загінулі па розных прычынах. Зафіксаваны выпадкі крадзяжу раслін [2]. Новых высадак не робіцца. Санітарныя чыстка праводзяцца неспецыялістамі і прыносяць больш шкоды, чым карысці.

Шмат шкоды нарабіла “добраўпарадкаванне” дэндрапарка, якое праводзілася на пачатку XX ст. На грошы, выладкаваныя раённай экалагічнай інспекцыяй была зроблена шмат кепскага. Сцежкі разрылі і паклалі тратуарную плітку. У выніку будаўніцтва вельмі пашкоджаны карані дрэваў у алеях, а большасць пліткі ўжо разрабавана. Ні ў водным парку Еўропы не ў парках не кладзецца плітка. Максімум – сцежкі пасыпаюць шамотам (тоўчанай цэглай). Адзіная карысць ад добраўпарадкавання – жалезны плот, усталяваны вакол парка.

Сцяжыны часта разбіты капытамі каней, якіх выгульваюць час ад часу ў парку. Калекцыйны пітомнік, які створаны яшчэ да рэвалюцыі для рамонту пасадак і азелянення тэрыторыі цяпер амаль не выконвае сваю функцыю. Яшчэ М.Т. Ражкоў планаваў стварыць некалькі дадатковых сцяжын для разгранічэння секцый парка.

Няма ў парку лавак. Моладзь штодня распівае алкагольныя напоі, пакідаючы пасля сябе бруд і смецце. Няма у парка не толькі садоўніка, ланшафтнага дызайнера, але і нават дворніка. Праўда, як кажуць – чыста не там, дзе прыбіраюць, а там, дзе не смецяць.

Лічым, што для далейшага развіцця прыроднаахоўнай тэрыторыі трэба вызначыцца з канцэпцыяй развіцця дэндрапарка. Якім шляхам яму ісці: сур’ёзная чыстка з падсадкай моладзі, ці яго фарміраванне на аснове “старэючага парка”. Пры любым сцэнары правесці інвентарызацыю

Репозиторий ВГУ

расліннага свету. Па-другое, вызначыцца з адказнай асобай і пэўным фінансаванні, ці праз дзяржаўныя органы, ці грамадскія арганізацыі. .

**Заключэнне.** Такім чынам, асноўнымі задачамі, якія трэба вырашыць для захавання Лужаснянскага дэндрапарка з'яўляецца вызначэнне канцэпцыі яго далейшага развіцця, пэўнае фінансаванне яго дзейнасці як з боку адказных асоб маёмасніка, так і дзяржаўных прыродаахоўных органаў.

Літаратура


1. План развіцця Лужаснянскага дэндрапарка // Асабісты архіў М.Т. Ражкова.
2. Буткевіч С. Ад чаго баліць галава ў Мікалая Ражкова? // Народная воля. – 2006. – 5 кастр. – С. 8.


# ЭВРИСТИЧЕСКОЕ ОБУЧЕНИЕ КАК ИННОВАЦИОННАЯ ФОРМА РАБОТЫ В ЭКОЛОГИЧЕСКОМ ОБРАЗОВАНИИ


***О.В. Поворова, Г.Н. Тихончук, Н.М. Новикова***

**МГУ имени А.А. Кулешова, г. Могилев, Республика Беларусь**

**МГЭИ имени А.Д. Сахарова БГУ, г. Минск, Республика Беларусь**

**e-mail: povorov@mail.ru**


**Введение.** Среди инновационных форм работы в экологическом образовании выделяют эвристическое обучение, прообразом которого является «сократовская ирония» – метод вопросов и рассуждений, когда философ приводил учеников к истинному пониманию через диалог: задается общий вопрос, на который получив ответ вновь вводится уточняющий вопрос и так до получения окончательного ответа. Главной задачей в эвристическом обучении является творческая самореализация обучающегося. Получив материал для конструирования без готовых знаний о нем он создает продукт деятельности (гипотезу, проводит эксперимент), а затем с помощью педагога сопоставляет его с аналогом исторически сложившимся в данной области. В результате переосмысливается личный результат и происходит личностное преобразование. Результат образования в эвристическом обучении непредсказуем, когда каждый обучаемый получает абсолютно разные итоги.

**Материал и методы.** Мыслительные действия (анализ, обобщение, составление схем и т.д.) это и есть эвристические операции, направляющие деятельность обучающегося на нахождение оптимального решения задачи. Для активации коллективной творческой деятельности нами наиболее широко применяются методы эвристического обучения: метод «мозгового штурма», синектический метод, метод дидактических игр при проведении экскурсий в ходе полевых практик, семинарских занятий, исследователь-

Репозиторий ВГУ